Падтрымай "Вясну" на PATREON

За акцыю ля Акрэсціна — штрафы

21.04.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Палітыкі разгарнулі сцяг ля Акрэсціна. Фота "Наша Ніва".

Менскія суды прысудзілі штрафы сустаршыні БХД Паўлу Севярынцу, прэс-сакратару Аб'яднанай грамадзянскай партыі Ганьне Красулінай і актывісту АГП Дзьмітрыю Кавалгіну — па 50 базавых велічыняў (1150 рублёў) за дзеяньні падчас сустрэчы Кавалгіна з «сутак» на Акрэсьціна.

21 красавіка ў судзе Маскоўскага раёну Менску адбыліся адміністрацыйныя працэсы над намеснікам старшыні Менскага гарадской арганізацыі АГП **Дзмітрыем Кавалгіным** і прэс-сакратаркай АГП **Ганнай Красулінай, а** таксама актывісткай **Маяй Наумавай.** Іх абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве (ч.3 арт. 23,34 КоАП).

Па інфармацыі Радыё "Свабода", Кавалгін казаў, што тады хацеў праверыць цэласнасьць вялізнага бел-чырвона-белага сьцяга — таму сьцяг разгарнулі некалькі чалавек.


«Мяне аштрафавалі тое, што я трымаўся за сьцяг, — кажа Свабодзе Севярынец, для якога гэта дваццаты штраф за каляндарны год. — Разгортваў сьцяг ня я, але паколькі сьцяг вялікі, трымалі яго ўшасьцёх. І вось як чалавеку, які трымаў бел-чырвона-белы сьцяг, мне выпісалі 50 базавых.

Вялікі бел-чырвона-белы сьцяг выклікае абсалютна такі „зьезд даху“ ў судзьдзяў, у міліцыянтаў… Калі на мяне міліцыянт афармляў пратакол, я сказаў яму: вы жа зьвярніце ўвагу, што гэта сьцяг Хрыста, ён на плашчах патрыярхаў, на абразах. А той міліцыянт мне спакойна: „Ведаеце, у чым праблема? Праблема ў тым, што я ў Бога ня веру“. Дык што, пратакол складаеце, бо ў Бога ня верыце?

Але горш за ўсіх давялося **Алесю Абрамовічу** з Барысава: яму прысудзілі прайсьці цягам месяца псыхіятрычную экспэртызу. Цяпер ён паехаў на „Вясну“ *(у Праваабарончы цэнтар „Вясна“. — РС)* разьбірацца, што гэта значыць».


Твитнуть





Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску




"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Дзень палітвязняў Беларусі. Да якіх мерапрыемстваў можна далучыцца?







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Бацьку і дачку пакаралі "хатняй хіміяй" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Палітзняволенаму Яну Папковічу прысудзілі 4 гады калоніі

Сяржук Сыс – Валянціну Стэфановічу: "Ганаруся табой, тваёй воляй і характарам"

Праваабаронца і валанцёрка "Вясны" Марыя Тарасенка: "Я маю ўнікальную магчымасць падтрымліваць людзей"


"Яго місія ў большым. Яго мэта — нешта дасягнуць і даказаць": вязні шклоўскай калоніі пра Вітольда Ашурка


Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY